былі ўзяты «литовские меры». Баярын Я. Чаркаскі для патрэб сваіх будных станаў у в. Знаменскае перагнаў у 1663 г. «122 больших литовских быка». Акрамя таго, на яго майданах працавалі шафары, якіх не было ні на майданах Б. Марозава, ні на будных станах цара.

Баярын Марозаў загадаў прыказчыку в. Мурашкіна, акрамя грошай, даваць палівачам і буднікам прадукты харчавання. Ён аплачваў працу палівача, які быў галоўнай фігурай на майдане, у залежнасці ад колькасці выробленага паташу. Баярын добра разумеў, што чым больш будзе бочак з паташом, тым большы будзе яго даход. Таму ў грамаце прыказчыкам вёсак Мурашкіна і Сяргач ён пісаў: «А на которых моих нижегороцких и орзамаских мойданех поливочи добры и мне раделли, поташу зделали по сту бочек слишком, и вам бы велеть тем поливочем давать за их работу по 20-ти руб. денег. А кои поливочи на коем мойдане меньши ста бочек зделали, и тем денежное жалованье давать по-старому...». Як відаць, такі прынцып аплаты палівачаў ужо не вязаўся з традыцыйным феадальным, а больш паходзіў на капіталістычны.

Буднікі працавалі часам і на работах, не звязаных з паташным промыслам. Так, у Казанскім павеце буднікі здабывалі медную руду.

У перапісной кнізе Сімбірскага павета 1678 г. запісана в. Панская, дзе жыло 85 чалавек іншаземцаў [3]. Пры параўнанні прозвішчаў асобных жыхароў вёскі з прозвішчамі буднікаў-беларусаў, якія жылі ў вотчыне М. Чаркаскага, знаходзім аднолькавыя. Так, прозвішча жыхара в. Панская Болдырь не раз сустракаецца сярод буднікаў Чаркаскага. Напісанне прозвішча жыхара гэтай вёскі Кузнечёнок з суфіксам -ёнок- характэрна і пасяленцам-беларусам князя (Грибченок, Млетченок, Шапуренок і інш.). Гэта дае падставу думаць, што жыхары в. Панскай былі выхадцамі з Беларусі. У другой палове XVII ст. у Паволжы пасялілася асабліва многа выхадцаў з Беларусі. Упамінанні аб іх мы знаходзім у перапісных кнігах шэрагу паволжскіх паветаў 1678 г. (на жаль, абазначаны яны ў большасці як «палякі», «літвіны», «іншаземцы» і да т. п.).

Аб тым, што пасяленне выхадцаў з Беларусі ў Паволжы было масавым, сведчаць і даныя вядомага лексікографа У. І. Даля. Не выпадкова ён адзначаў у Ніжагародскай губерні асаблівую гаворку «яготский, лукояновский, где жителей зовут ягунами (от яго, яму), будаками (от бывших будных майданов, это переселенцы с Литвы), также панами». Тут жа ён указаў на змешаную гаворку ў Ардатаўскім, частцы Арзамаскага, Лукаянаўскага, Сяргацкага і нават Княгінінскага паветаў, дзе «есть и дзеканье». Пры гэтым Даль зазначыў, што «весь край этот коренной мордовский, но он обрусел и заселен со времен Грозного, то ссыльными, пленною литвою, то переселенцами, для основания поташных майданов». Пісьменнік і этнограф П. Мельнікаў прыкмеціў, як паводле асобных слоў, запісаных у некаторых вёсках Лукаянаўскага павета, Даль зрабіў вывад: «Это белорусы».

Беларускія перасяленцы-буднікі разам з рускімі сялянамі і народамі Паволжа ўнеслі важкі ўклад у яго асваенне. А ў перыяд сялянскай вайны пад кіраўніцтвам Сцяпана Разіна яны разам змагаліся супраць прыгнятальнікаў.

Так у сумеснай працы і барацьбе гартавалася дружба народаў Расіі.

[3] Мартынов П. Опись городу Симбирску и его уезду в 1678 году. Симбирск, 1902, с. 55—56.

# НАВУКОВЫЯ ЎСТАНОВЫ І ТАВАРЫСТВЫ

**М. Ф. ХАРТАНОВІЧ,**
**гісторык,**
**Г. У. КАРЗЕНКА,**
**аспірант Інстытута гісторыі АН БССР**

У другой палове XIX ст. развіццё ў Беларусі капіталізму ва ўмовах растучага эканамічнага і культурнага збліжэння беларускага і рускага народаў і ўплыў перадавых ідэй рускай культуры стварылі ўмовы для развіцця беларускай грамадскай думкі, літаратуры дэмакратычнага кірунку, вывучэння нацыянальнай гісторыі.

У Беларусі ў першай палове XIX ст. не было гістарычных установаў навучальнага, навуковага і асветніцкага кірунку. Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі ўвайшлі ў склад Расіі. У Беларусі аказалася велізарная колькасць старажытных актаў, якія захоўваліся ў архівах розных урадавых устаноў. Гэта быў каштоўны матэрыял для вывучэння пытанняў гістарычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краю. Планамерная работа па сістэматызацыі гістарычных матэрыялаў

і дакументаў пачынаецца з 30-х гадоў XIX ст.

Перш за ўсё на архіўныя багацці тэрыторыі звярнула ўвагу Пецярбургская археалагічная камісія, якая ставіла сваёй мэтай збіранне гістарычных помнікаў айчыннай гісторыі [1]. Яна і пачала вывучэнне правінцыяльных архіваў Заходняй Расіі. Па яе распараджэнню прывезлі старажытныя дакументы, знойдзеныя ў маёнтку князя Сапегі, і акты 1646—1760 гг., якія маюць дачыненне да гісторыі Расіі і Польшчы.

У 1852 г. у Кіеве, Віцебску і Вільні ствараюцца цэнтральныя архівы, дзе збіраліся старажытныя актавыя кнігі. Але трэба адзначыць, што і арганізацыя дзяржаўных архіваў не вырашыла цалкам праблему ўпарадкавання, сістэматызацыі гістарычных матэрыялаў. Маючы важнае практычнае значэнне, валодаючы велізарнай колькасцю гісторыка-юрыдычных дакументаў, Віцебскі і Віленскі архівы былі лабірынтамі, у якіх не маглі разабрацца не толькі пабочныя асобы, але і самі архіварыусы. Вельмі цяжка было працаваць у Віцебскім архіве, дзе даваць юрыдычныя даведкі, сістэматызаваць і выдаваць гістарычныя дакументы павінен быў адзіны супрацоўнік Сазонаў. Тым не менш, пачынаючы з 1871 г., на працягу 9 гадоў ён падрыхтаваў 10 вялікіх тамоў свайго выдання «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы, узятыя з актавых кніг губерань Віцебскай і Магілёўскай».

У Віцебску працаваў яшчэ архіў Віцебскага губернскага праўлення, які захоўваў справы полацкага намеснага праўлення і канцылярый генерал-губернатараў віцебскага, магілёўскага, смаленскага і калужскага.

Некалькі ведамасных архіваў было ў Магілёве: 1. Архіў пры Магілёўскай семінарыі. (Агульная колькасць дакументаў на 1898 г.— 4349 ад.); 2. Архіў пры Брацкім манастыры. (Большая частка дакументаў надрукавана ў Віленскім археаграфічным зборніку); 3. Семінарскі архіў; 4. Архіў губернскага праўлення; 5. Музей пры губернскім статыстычным камітэце, дзе захоўваліся унікальныя дакументы, як, напрыклад, арыгінал граматы караля Сігізмунда III, граматы караля Станіслава-Аўгуста 1767 г. і г. д.

У Мінску ў пачатку XX ст. было 5 архіваў. Сярод іх найбольш буйным быў архіў Свята-Духава манастыра, які складаўся з дакументаў Слуцкага манастыра з 1517 па 1837 г., 204 пераплеценых кніг, дакументаў (старажытныя граматы і акты на лацінскай, рускай і польскай мовах), указаў і маніфестаў з 1747 па 1826 г. і г. д.

[1] Ленінградскае аддзяленне ААН СССР, ф. 133, воп. 1, сп. 37, арк. 7.



У пачатку XX ст. у гэтым будынку ў Мінску размяшчаўся царкоўна-археалагічны музей.

У сістэму дзяржаўных гістарычных устаноў уваходзілі і вучоныя камісіі. Так, Віцебская вучоная архіўная камісія была арганізавана ў 1909 г. Яна ўзяла на сябе выкананне адказнай задачы па сістэматызацыі не толькі гістарычных дакументаў, але хутчэй юрыдычных, і пашырэнню гістарычных ведаў у Беларусі. Яе бліжэйшымі абавязкамі былі: а) аналіз старажытных рукапісаў і дакументаў; б) збіранне прадметаў старадаўнасці; в) сувязь з навуковымі ўстановамі па пытаннях выдання дакументаў; г) ахова старадаўніх помнікаў. Камісія арганізоўвала лекцыі на гісторыка-археалагічныя тэмы, праводзіла экскурсіі. У распараджэнні камісіі былі архіў, музей і бібліятэка.

Інакшай формай работы гістарычных устаноў была дзейнасць навуковых таварыстваў. У выніку спецыфічнага становішча ў самаўладнай дзяржаве, калі дзейнасць дзяржаўных устаноў была выразна рэгламентавана, што скоўвала развіццё творчай ініцыятывы, яны былі той сферай, дзе гэтая ініцыятыва магла ажыццяўляцца.

Мінскае таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі было заснавана ў 1912 г. Яно займалася вывучэннем і даследаваннем па заалогіі, батаніцы, геалогіі, глебазнаўству, а таксама па антрапалогіі, этнаграфіі, статыстыцы, археалогіі, арганізацыяй прыродазнаўча-гістарычнага музея і распаўсюджаннем гістарычных ведаў у Мінскай губерні [2].

У 1867 г. у Вільні быў адкрыты Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Пазней была арганізавана секцыя археалогіі і археаграфіі, якая звяртала ўвагу на старажытную геаграфію Паўночна-Заходняга краю і для гэтай мэты планавала выданне старажытных інвентароў гарадоў і складанне алфавітных паказальнікаў старажытных назваў мясцовасцей.

[2] Этнографическое обозрение, 1912, № 3, с. 193.




Цікавыя і такія навуковыя ўстановы, як камітэты. У 1907 г. на старонках перыядычнага друку Мінска з'явіліся артыкулы Д. Скрынчанкі, дзе гаварылася пра тое, што ў Мінску неабходна заснаваць гісторыка-археалагічны камітэт. Гэты заклік сустрэў спачувальны водгук сярод мясцовай інтэлігенцыі, бо такой установы ў губерні не было. Адкрыццё Камітэта адбылося ў 1908 г. Сродкі гэтая грамадская арганізацыя атрымлівала з членскіх узносаў, разавых ахвяраванняў і збораў, якія паступалі ад чытанняў і канцэртаў, а таксама субсідый, што прысылала Аддзяленне рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук. Такая падтрымка дазваляла Камітэту выдаваць выпускі «Минской старины» з дадаткам «Описания рукописей Комитета». Пры ім была адкрыта навуковая бібліятэка, якая захоўвала творы гістарычнага і філалагічнага зместу.

Асветніцкія камітэты былі і ў іншых гарадах Беларусі. Так, у Гродна ў 1905 г. быў створаны «Гістарычны камітэт», які меў царкоўна-гістарычны музей, што размяшчаўся ў Барысаглебскім манастыры.

У Беларусі было шмат царкоўна-гістарычных музеяў. Гэтыя ўстановы ўзніклі ў 90-х гадах XIX ст. Першы такі музей пачаў працаваць у Віцебску ў 1893 г., праз 4 гады адкрыўся Магілёўскі царкоўна-гістарычны музей, а ў 1908 г.— у Мінску [3]. Ініцыятарам іх стварэння быў заўзяты краязнаўца і этнограф Я. Раманаў. Ён падрыхтаваў некалькі экспедыцый, у час якіх сабраў багаты матэрыял для свайго «Беларускага зборніка». Я. Раманаў апублікаваў каля 200 работ і ўнёс вялікі ўклад у вывучэнне этнаграфіі Беларусі.

У 1899 г. Віцебскі музей выпусціў «Апісанне прадметаў старажытнасцей, якія паступілі ў музей». Вялікай гістарычнай каштоўнасцю былі рукапісныя кнігі цэркваў і манастыроў Полацкай епархіі. У структуры Магілёўскага музея было 5 аддзелаў: іканаграфічны, уніяцкі, рукапісны, царкоўных рэчаў, свяшчэннага адзення. Экспазіцыямі былі старажытныя іконы, крыжы, плашчаніцы, харугві, статуі і іншыя царкоўныя рэчы. У 1906 г. у фондах налічвалася 1284 прадметы. У бібліятэчным аддзеле знаходзіліся выданні XVI—XVII ст. Быў пры музеі і архіў, у якім захоўвалася 4 тыс. дакументаў XVII ст.

Такім чынам, у канцы XIX — пачатку XX ст. у Беларусі афарміліся наступныя тыпы дзяржаўных і грамадскіх навуковых устаноў: дзяржаўныя гістарычныя архівы, вучоныя камісіі, гістарычныя камітэты, музеі і навукова-асветніцкія таварыствы. Іх дзейнасць дазволіла больш актыўна весці работу па выяўленню, сістэматызацыі і публікацыі помнікаў гісторыі і культуры. Карпатлівы збор, апрацоўка, навуковы аналіз і наступнае выданне дакументаў уносілі пэўны ўклад у развіццё айчыннай гісторыі як навукі, дазвалялі па-новаму асвятліць мінулае Беларусі. Становучая роля гэтых устаноў у тым, што яны накапілі велізарны фактычны матэрыял, які не страціў сваёй каштоўнасці і цяпер.

---

[3] Записки Северо-Западного отдела РГО, кн. 1, 1910, с. 222.

# ЭКСПАНАТ—МАСТАВАЯ

Прынята рашэнне аб стварэнні ў Віцебску археалагічнага музея. У трох яго павільёнах плошчай каля тысячы квадратных метраў будуць прадстаўлены ўчасткі гарадской забудовы XII—XVI ст. У экспазіцыю ўвойдуць вулічныя маставыя, жылыя і гаспадарчыя будынкі, прадметы побыту, прылады працы жыхароў старажытнага і сярэдневяковага Віцебска.